Арганізацыйным якасцям, творчым здольнасцям сацыяльны педагог павінен навучыцца ў працэсе лекцыйных, практычных і індывідуальных заняткаў. Увесь працэс прафесійнай падрыхтоўкі ў гэтым напрамку падпарадкоўваецца галоўнай задачы -- усебаковаму ўзбраенню будучага спецыяліста тэарэтычнымі ведамі і практычнымі ўменнямі пастановачнай работы, падрыхтоўцы сацыяльнага педагога да самастойнай творчай дзейнасці.

Аксюцік М.І.,
канд. пед. навук,
дацэнт

## СТАНАЎЛЕННЕ ЭКАЛАГІЧНАЙ СВЯДОМАСЦІ НАСЕЛЬНІЦТВА Ў СУЧАСНЫХ УМОВАХ

Сучасная экалагічная сітуацыя вызначаецца шэрагам крызісных з'яў у стане грамадства, асабіста ў сферах гаспадарчага выкарыстання прыродных рэсурсаў і духоўных зносін чалавека і прыроды. Для пераадолення гэтых з'яў неабходна павысіць экалагічную свядомасць насельніцтва. Станаўленне экалагічнай свядомасці адбываецца як у працэсе грамадскай экалагічнай дзейнасці, так і пад уплывам шырокай экалагічнай асветы людзей.

Экалагічная асвета (і яе састаўная частка пазашкольнае экалагічнае выхаванне) з'яўляецца адной з найважнейшых у шэрагу праблем сучаснай рэчаіснасці. Іх узаемасувязь наступная: сучасная экалагічная сітуацыя - экалагічная свядомасць - экалагічная асвета і экалагічнае выхаванне, у тым ліку і ва ўстановах культуры, якія арганізуюць вольны час і маюць магчымасць прыцягваць вялікую колькасць людзей рознага ўзросту.

Працэс станаўлення экалагічнай свядомасці насельніцтва ва ўстановах культуры, у тым ліку ў клубах, праходзіць наступныя стадыі:

-- унясенне элементаў экалагічнай прапаганды ў масавыя і групавыя формы дзейнасці клуба па экалагічнаму выхаванню;

-- фарміраванне грамадскай думкі па праблемах навакольнага асяроддзя;

-- дзейнасць наведвальнікаў клубных устаноў у аматарскіх аб'яднаннях экалагічнага накірунку.

Клубныя ўстановы ажыццяўляюць працэс экалагічнага выхавання з улікам дыферэнцыяцыі розных груп насельніцтва, зыходзячы з іх адносін да прыроды. Пры гэтым неабходна звярнуць увагу на наступныя крытэрыі выніковасці экалагічнай прапаганды, якія мы вызначылі ў працэсе даследавання:

а) выкарыстанне перш за ўсё мясцовага матэрыялу, звязанага з ахоўвай навакольнага асяроддзя свайго рэгіёна, улік мясцовай экалагічнай сітуацыі;

б) пераважнае выкарыстанне маральна-эстэтычнага аспекту экалагічнага выхавання, які спрыяе развіццю ў насельніцтва патрэбы цесных і разнастайных зносін з прыродай, магчымасці бачыць яе прыгажосць і гармонію і ажыццяўляць любую дзейнасць у прыродзе зыходзячы з законаў гэтай прыгажосці і гармоніі.

Калачова І.І.,
аспірантка

## РОЛЯ СЯМЕЙНЫХ ЭТНАПЕДАГАГІЧНЫХ ТРАДЫЦЫЙ БЕЛАРУСАЎ У ПАВЫШЭННІ ПЕДАГАГІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ БАЦЬКОЎ

Сямейныя этнапедагагічныя традыцыі -- значная частка духоўнай культуры беларускага народа. Вывучаць і развіваць іх для ўжывання ў сучаснай сям'і -- адна з задач педагагічнай практыкі бацькоў, якія заўсёды адыгрывалі значную ролю ў выхаванні дзяцей.

У традыцыйнай сям'і беларусаў бацькі з'яўляліся носьбітамі сапраўдных уяўленняў аб чалавеку, аб жыццёвых з'явах, аб дабры і зле. Яны заўсёды ведалі, як патрэбна жыць, і хацелі гэтаму навучыць сваіх дзяцей. Галоўны клопат бацькоў быў навучыць дзяцей працаваць на зямлі, карысным справам, рамяству. Лічылася: умееш працаваць, будзе і багацце, і дабрабыт. Маральныя нормы паводзін бацькі чэрпалі ў мудрых народных запаветах. Клапаціліся аб сямейным лёсе дзяцей, які часта вызначалі самі. Выходзячы замуж, дачка казала: «То воля маткі, то воля бацькі, то воля не мая».

У сучаснай сям'і ўяўленні аб шчаслівым лёсе дзяцей з'яўляюцца размытымі. Змяніліся жыццёвыя каштоўнасці, жыццёвыя ўстаноўкі, ідэалы. У моладзі адбываецца трансфармацыя ўстановак на розныя віды працоўнай дзейнасці. Добра зарабляюць і жывуць сёння не тыя, хто непасрэдна вырабляе прадукцыю, а тыя, хто займаецца збытам і перапродажам гатовых тавараў. Значнасць сямейнага жыцця як «ачага» таксама змянілася. Бацькі не заўсёды могуць быць люстэркам сямейных адносін, аўтарытэтам для дзяцей.

Народная думка сцвярджала: «Бацькі -- лепшыя настаўнікі», «Бацькоўская навука да веку помніцца». Бацькі даюць прыклады павагі да старэйшых людзей, і ў першую чаргу да сваіх бацькоў. Уплыў бабы і дзеда на дзяцей грунтаваўся на іх бясспрэчным аўтарытэце, бо гэта людзі з больш багатым жыццёвым вопытам, пачынальнікі роду, захавальнікі сямейных звычаяў. Старыя ў сям'і стваралі ўтульнасць, неслі цеплыню, дабрыню, міласэрнасць, палягчалі працу гаспадыні, дапамагалі ў хатніх справах, шмат часу праводзілі з дзецьмі.

У сучаснай сям'і ўзаемаадносіны з прадстаўнікамі старэйшага пакалення складаюцца інакш. Часта

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ